УДК 821.161.3.09

# ВЫХАВАЎЧА-АСВЕТНІЦКІЯ МАТЫВЫ Ў БЕЛАРУСКАЙ ЖАНОЧАЙ ПАЭЗІІ ДРУГОЙ ПАЛОВЫ XX ст.

**І.І. Шматкова**
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт
вул. К. Маркса 31, 220030, Мінск, Рэспубліка Беларусь
i.shmatkova@gmail.com

**Анатацыя.** У артыкуле разглядаюцца выхаваўча-асветніцкія матывы ў творчасці Е. Лось, Я. Янішчыц, Н. Мацяш, Г. Каржанеўскай, Р. Баравіковай, Н. Шкляравай, І. Багдановіч і інш. беларускіх паэтэс як самабытных прадстаўніц жаночай плеяды другой паловы XX стагоддзя; на матэрыяле іх вершаваных твораў аналізуецца роля іх паэзіі для будучых пакаленняў.

***Ключавыя словы*:** выхаваўча-асветніцкія матывы; беларуская жаночая паэзія; маральна-гуманістычныя каштоўнасці.

# EDUCATIONAL MOTIVES IN BELARUSIAN WOMEN'S POETRY OF THE SECOND HALF OF THE XX CENTURY

**I.I. Shmatkova**
Belarusian State University
st. K. Marx 31, 220030, Minsk, Republic of Belarus

**Annotation:** the article examines educational motives in the works of E. Los, E. Yanishchits, N. Matyash, G. Korzhenevskaya, R. Borovikova, N. Shklyarava, I. Bogdanovich and other Belarusian poetesses as distinctive representatives of the female group of the second half of the 20th century; the role of their poetry for future generations is analyzed on the basis of their poems.

**Keywords:** educational motives; Belarusian female poetry; moral and humanistic values.

Беларуская жаночая паэзія – крыніца шчырых пачуццяў і перажыванняў, яна змяшчае ўнікальны эмацыянальны вопыт. Выхаваўчым пафасам, зваротам да маладых прасякнуты многія вершы беларускіх паэтэс другой паловы XX ст. У гэтым адлюстраванне спецыфікі жаночай літаратуры. Менавіта думкай пра духоўнае пераўтварэнне жыцця, гармонію існавання, магчымасць чалавечага шчасця асвечана лірыка кожнай з іх. Жанчына, калі яна ўсведамляе сваю місію на зямлі, мае яшчэ больш высокае

прызначэнне – хваляваццa, клапаціцца пра маральнае ўладкаванне грамадства, народны лёс, будучыню чалавецтва.

І нельга недаацэньваць значнасць жаночай творчасці для дзяцей, беларускія паэтэсы з'яўляюцца прадаўжальніцамі выхаваўча-асветніцкай дзейнасці славутых папярэдніц, такіх як Е. Полацкая, Цётка і інш. Яны звязваюць нашу будучыню з дзяцінствам, моладдзю... Час ускладніўся, бо вечныя каштоўнасці, на жаль, страчваюць сваю актуальнасць і значнасць. Як сцвярджае літаратуразнаўца В. Жылевіч, "у сучаснай сям'і – падмурку будучага жыцця дзіцяці – усё меней звяртаецца ўвагі на тое, каб закласці нормы маральных паводзін з маленства" [1, с. 127].

Многае пачынаецца з сям'і, выхавання, менавіта таму шмат твораў для дзяцей напісана беларускімі паэтэсамі другой паловы ХХ ст. (зборнікі Еўдакіі Лось "Абутая елачка", "Казка пра Ласку", "Вяселікі" і інш., Ніны Мацяш "Два браты і сякера", "Казка пра суседзяў, змяю і мядзведзя" і інш., Галіны Каржанеўскай "На што падобна аблачынка", "Сінічка на балконе" і інш., Раісы Баравіковай "Галенчыны "Я", альбо Планета Цікаўных Хлопчыкаў" і інш., Ніны Шкляравай "Красворды і загадкі для вашага дзіцяткі" і інш., Ірыны Багдановіч "Альбом першакласніцы" і інш.).

Паэтэсы выказвалі ў вершаваных радках свае думкі, надзеі, перажыванні, трывогі, інакш кажучы, выяўлялі чалавечнае ў чалавеку, разлічвалі на водгук-суперажыванне у сэрцы маладога чытача. Е. Лось спадзявалася, што паэзія спараджае сустрэчны рух – духоўную камунікацыю: *"Нясу я вершы // ў маладосць // і спадзяюся: адгукнецца!.."* [2, с. 53]. Заўсёды ёсць надзея: пэўныя словы змогуць дапамагчы адчуць сваю інтымна-чалавечую сутнасць, перамяніць ход думак, перасцерагчы ад магчымых памылак, выклікаюць развагі аб жыцці. Рыхтуючыся да сустрэчы з чытачом, Е. Лось старанна, з вялікай адказнасцю і хваляваннем адбірала вершы: *"А ці навучыць першы, // Другі ці будзе спеты, // Ці клікне маладога // Да палкага кастра"* [2, с. 46].

Роля паэзіі ў жыцці як асобнага маладога чалавека, так і грамадства ўвогуле надзвычай істотная, нават неаспрэчная, бо змяшчае ўнікальны эмацыянальна-эстэтычны змест, які здольны пераўтварыць асобу. Паэты імкнуцца данесці эстэтычныя ідэалы і каштоўнасці праз слоўны вобраз, думку-пачуццё. Духоўная аснова мастацтва ўключае чалавека ў працэс жыццятворчасці па законах прыгажосці. Паэзія дапамагае *"асэнсаваць, "абжыць" новыя бакі і з'явы жыцця, павялічыць свае магчымасці мастацкага пазнання і абагульнення рэчаіснасці"* [3, с. 293]. Вельмі важна, каб паэзія заставалася на баку праўды, духоўнай свабоды, захоўвала нацыянальны дух. Н. Мацяш, напрыклад, асэнсоўвае праблему матэрыяльнага і духоўнага ў грамадстве, ролю мастацтва ў вырашэнні гэтай

праблемы: *“Я не ведаю ніводнага, колішняга ці сучаснага, грамадства, у якім бы духоўнае пераможна панавала над матэрыяльным. Паўсюль “душа йшчэ з дзерава не злезла” (Л. Кастэнка). <…>Адсюль – фетышызацыя маёнткаў і пагарджэнне скарбамі нацыянальнай ды агульначалавечай культуры. Мастацтва ж, як праява духоўнасці, цягам усяго шматвяковага развіцця чалавечай цывілізацыі ўпарта, бесперапынна, усімі даступнымі яму сродкамі, у тым ліку й літаратурай, нагадвае людзям пра іншыя вымеры жыцця. Пра сапраўды нятленныя каштоўнасці, такія як любоў, праўда, чалавечнасць, сумленне. Пра ўсё тое, без чаго чалавек на зямлі так і застаецца драпежным зверам ці вартай жалю кормнай жывёлінай”* [4, с. 134].

У 2012 г. беларуская паэтэса Н. Шклярава выдала кнігу выбранага “Млён”. Лірычная гераіня дзеліцца ўсімі сваімі набыткамі з людзьмі, не патрабуючы нічога ўзамен: *“І не трэба ні медзі, ні срэбра, // Ані шумнае славы і слоў…”* [5, с. 32]. Свой талент і майстэрства паэтэса перадае ў першую чаргу маладым – яна заснавала першую ў рэспубліцы школу “Малады літаратар” на базе Гомельскага абласнога Палаца творчасці дзяцей і моладзі. За час работы школы Н. Шклярава адкрыла дзверы ў свет паэзіі і прозы многім маладым аўтарам (Алесь Бараноўскі, Ганна Новік, Маша Маліноўская, Таццяна Нілава, Стася Кацюргіна і інш.).

Ніна Шклярава ўзнагароджана нагрудным знакам “За вялікі ўклад у літаратуру”, дыпломам міжнароднага конкурса “Сузор’е талентаў” сярод педагогаў і адоранай моладзі. Але большым яе гонарам з’яўляюцца дыпломы за перамогі ў конкурсах яе выхаванцаў, маладых літаратараў школы: *“Серабро, серабро, серабро, // Залацістага вэлюму дым!.. // Залатое маё ўсё дабро – // Маладым, маладым, маладым”* [5, с. 196]. Як зазначыла аўтарка ў адным са сваіх інтэрв’ю, змешчаным на апошняй старонцы кнігі “Млён”: *“Ёсць плён, а гэтае галоўнае. Значыць, ёсць будучыня ў нашай літаратуры”* [5, с. 196].

Яшчэ адна беларуская паэтэса, літаратуразнаўца і выкладчыца Ірына Багдановіч таксама апякуецца маладымі талентамі – яна кіруе студэнцкім літаратурным гуртком філалагічнага факультэта БДУ “Альтанка”.

Яе паэзія, – напрыклад, кніга вершаў “Чаравікі маленства” – наскрозь пранізана цёплымі, пяшчотнымі вобразамі дзяцінства: *“чаравікі маленства”, “з падскокамі сандалі”, “сукенка аблачынкай”, “гумавы мячык”, “пахнуць цукеркамі ручкі”, “лялька старая стала, лялькі старэюць рана”, “ляльку замяніла кніга”* і інш. Чароўны свет маленства вымалёўваецца паэтэсай пад уплывам яе асабістага шчаслівага дзяцінства, якое яна правяла ў любімых дзядулі з бабуляй, пра што аўтарка піша: *“і ў гэтым цяпер я бачу неверагодную праяву Гасподняй ласкі над маім лёсам. Бо я спазнала глыбіні*

*дабрыні і пяшчоты, вялікую любоў да мяне, далікатную выхаваўчую апеку людзей, ад прыроды адораных тактоўнасцю і педагагічным талентам, мудрасцю і цярплівасцю, тою асаблівай унутранай шляхетнасцю, годнасцю, культурнасцю, пачуццём справядлівасці…"* [6, с. 340]. Усе гэтыя якасці, на наш погляд, спаўна перадаліся і самой І. Багдановіч, як і многім беларускім паэтэсам.

Творы са зборніка вершаў "Чаравікі маленства" асвечаны мацярынскай любоўю да дзетак. Для аўтаркі шчаслівае дзяцінтва – заклад шчаслівага дарослага жыцця, і калі гэта абавязковую ўмову дарослыя выканаць не могуць, словы апраўдання знайсці цяжка. У вершы "Дзіцячы дом" ("Фрэскі", 1989 г.) паэтэса, проста праходзячы міма дзіцячага дому, ужо адчувае сябе вінаватай: *"Я вінаватаю сябе адчула за ўсіх жанчын, // Нібыта гэта я... // Ёсць страшны суд дзіцячай адзіноты..."* [7, с. 48]. Мацярынская спагада, дабрыня, любоў – адзін з галоўных нерваў жаночай паэзіі. Дарэчы, у кнізе "Чаравікі маленства" паэтэса вызначае яшчэ адну ўмову шчаслівага дзяцінства – родны дом – *"Маленькая, ціхая гавань, // Дзе не мяняюць на срэбра // Ні ганьбу тваю, ні славу. // Дзе ты жаданы і родны // У сонечных промнях ці ў брудзе, // У старых лахманах ці модны — // Усякі прыгожы будзеш…"* [36, с. 6]. Вобраз дому, увогуле, адзін з вядучых не толькі ў беларускай, але і ва ўсёй славянскай літаратуры, гэта сакральнае месца, якое ўвасабляе адзінства сям'і і роду, малой радзімы і ўсяго Сусвету. У творчасці І. Багдановіч дом – гэта сваё, роднае, радзімае, тое, што супрацьстаіць чужому; у абагуленым сэнсе, у паэтэсы, дом – гэта Радзіма.

На прыкладзе лірычнай творчасці беларускіх паэтэс другой паловы XX ст. можна пераканацца, што паэзія прэзентуецца беларускімі аўтаркамі другой паловы XX стагоддзя як высокадухоўная субстанцыя, у якой выхавальніцка-асветніцкі пафас адзін з галоўных, ён скіраваны да чалавечага грамадства з мэтай яго духоўнага і маральнага пераўтварэння па законах прыгажосці.

**Бібліяграфічныя спасылкі**

1. Жылевіч, В. Ф. Роля біблейскіх міфалагем у рамане-прапавесці "Элеазар, альбо Крыніца і Куст" Мішэля Турнье // Вестник Полоцкого государственного университета = Веснік Полацкага дзяржаўнага універсітэта = Herard of Polotsk State University. Серия А. Гуманитарные науки: научно-теоретический ежемесячный журнал. – 2006. – № 1. – С. 126 – 130. – [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://elibrary.ru/item.asp?id=25499629. – Дата обращения: 07.02.2021.

2. Лось, Е. І каласуе даўгалецце / Е. Лось. – Мінск: Маст. літ., 1998. – 367 с.

3. Гніламёдаў, У.В. Сучасная беларуская паэзія: творчая індывідуальнасць і літаратурны працэс / У.В. Гніламёдаў. – Мінск: Навука і тэхніка, 1983. – 304 с.

4. Шматкова, І. Наталіцца роднасці святлом...: Агульнае і адметнае ў творчасці Е. Лось, Н. Мацяш, Г. Каржанеўскай / І.І. Шматкова; навук. рэд. А.І. Бельскі. – Мінск: Ковчег, 2011. – 148 с.

2. Шклярава, Н. Млён: вершы, паэмы, балады 1971 – 2012 / Ніна Шклярава. – Мінск: Кнігазбор, 2012. – 200 с.

3. Багдановіч, І. Залатая Горка: вершы, пераклады, атрыкулы / Ірына Багдановіч. – Мінск: Кнігазбор, 2016. – 400 с.

4. Багдановіч, І. Фрэскі: вершы і паэмы / Ірына Багдановіч. – Мінск: Маст. літ., 1989. – 118 с.